№ 175 (297)
Пятніца, 3 кастрычніка 1997 г.
Выдаецца на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Выдавец — ТАА "Народная воля"
Кошт: у кіёсках і крамах — 2000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

*На прастор, на шырокі разлог*
*Выхадзі, мой народ, грамадою...*

**Якуб Колас**

# Народная Воля



**Сонца**

| | Усход | Заход |
|---|---|---|
| Віцебск | 7.05 | 18.33 |
| Магілёў | 7.03 | 18.33 |
| Гомель | 7.00 | 18.31 |
| Мінск | 7.14 | 18.43 |
| Гродна | 7.29 | 18.59 |
| Брэст | 7.29 | 19.00 |

*Першая квадра 9 кастрычніка*



Печально

## Красный свет для Александра Лукашенко и Слободана Милошевича?

Президенты только двух государств — Югославии (Слободан Милошевич) и Беларуси (Александр Лукашенко) не получили приглашения на встречу в верхах, которая пройдет во французском городе Страсбурге 9—10 октября.

Нежелание видеть себя в одной компании с Жаком Шираком, Борисом Ельциным и другими главами европейских государств сильно обидело Александра Лукашенко. И потому есть информация, что в Страсбург срочно выехал посол Беларуси во Франции Владимир Сенько. Бывший министр иностранных дел Беларуси привез с собой письмо нынешнего министра Ивана Антоновича. В этом документе утверждается, что приоритетом во внешней политике нашей страны является вхождение в Совет Европы (а как же тогда российский вектор?), а потому и содержится просьба пересмотреть принятое решение и пригласить президента Беларуси на встречу в верхах.

В ответ главе внешнеполитического ведомства якобы написали, что на саммит приглашаются руководители только тех государств, которые или уже входят в Совет Европы или имеют статус "специально приглашенного".

Беларусь, равно как и Югославия, не попадает ни в первую, ни во вторую группу. Поэтому Александру Лукашенко и Слободану Милошевичу зажгли красный свет.

Один из высокопоставленных европейских чиновников, с которым я на днях разговаривал, сказал, что это решение практически окончательное. Поскольку приглашения главам государств исходят от президента Франции Жака Ширака (по месту проведения встречи), то, по мнению моего собеседника, единственным реальным вариантом участия Александра Лукашенко во встрече в верхах была бы личная просьба Бориса Ельцина к "другу Жаку" все же сделать для президента Республики Беларусь исключение. Но, зная нынешние отношения между президентом России и его белорусским коллегой, в такую просьбу трудно поверить.

Высокопоставленный европейский чиновник, комментируя решение не приглашать президента Беларуси на саммит, заявил: "Это — не изоляция Беларуси, это — самоизоляция вашего государства. Когда официальные лица Беларуси говорят нам о желании присоединиться к европейскому сообществу, мы всегда отвечаем: выполняйте необходимые условия — и тогда, как у вас говорится, милости просим..."

По словам моего собеседника, свои опасения по поводу ситуации в Беларуси руководители "тройки" высказали Александру Лукашенко еще во время саммита ОБСЕ в Лиссабоне. Однако тогда белорусский президент в свойственной ему агрессивной манере ответил, что, мол, вы плохо владеете истинной ситуацией в республике. Тогда и было решено послать в Беларусь представителей европейских организаций. После их посещения Минска и родилась идея трехсторонних консультаций с участием представителей Администрации президента Беларуси, депутатов Верховного Совета 13-го созыва и делегации евроструктур.

Высокопоставленный чиновник опроверг также появившееся в некоторых официальных средствах массовой информации Беларуси сообщение о том, что евроделегация на трехсторонних переговорах якобы настаивала на возобновлении действия Конституции Республики Беларусь 1994 года. Мой собеседник подчеркнул: этот Основной Закон несовершенен, но новая Конституция, с поправками и изменениями, принятыми на референдуме, еще хуже. Поэтому позиция делегации евроструктур заключается в разработке нового варианта Основного Закона, в котором был бы четко зафиксирован общепринятый принцип разделения властей.

Мой собеседник высказал свое мнение и по поводу возвращения Беларуси в Межпарламентский союз, что было зафиксировано на ассамблее в Каире. Известно, что официальные лица в Минске устроили по этому поводу великие торжества. Но это просто смешно. "МПС — это организация, которая при принятии новых членов не оговаривает каких-то условий, в нее входят парламенты 138 государств, — подчеркнул мой собеседник. — Среди них представлены такие государства, как Северная Корея, Куба, Ирак и другие далекие от демократических норм жизни страны. Почему бы среди них не быть и Беларуси? Если бы Межпарламентский союз не вернул Беларусь в свои ряды, то я бы первым сказал: "МПС применяет двойные стандарты". По его мнению, ошибка была допущена в Сеуле, когда Беларусь исключили из Межпарламентского союза.

Кстати, получив затем по факсу Устав МПС, я лично убедился, что в эту универсальную организацию не принимают только в двух случаях: в первом — если парламент по каким-то причинам перестал функционировать, и во втором — если в течение трех лет не платятся членские взносы. Так что восстановление своего членства в Межпарламентском союзе для Беларуси, на мой взгляд, имеет только одно последствие — утечку валюты из госказны на уплату взносов и поездок господ-товарищей из Национального собрания по экзотическим регионам мира.

**Владимир ГЛОД.**

## Прэзідэнт зрабіў назначэнні

Як паведаміла прэс-служба кіраўніка дзяржавы, указамі прэзідэнта краіны назначаны:

Бузо Мікалай Паўлавіч — намеснікам міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь;

Хвастоў Міхаіл Міхайлавіч — Надзвычайным і Паўнамоцным паслом Рэспублікі Беларусь у Канадзе;

Андрэеў Ігар Сцяпанавіч — дырэктарам Нацыянальнага цэнтра законапраектнай дзейнасці пры прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Кіраўнік дзяржавы даў згоду на назначэнне:

Муляка Уладзіміра Вітальевіча — на пасаду генеральнага дырэктара вытворчага аб'яднання "Беларуснафта";

Сіваева Аляксандра Мікалаевіча — на пасаду старшыні Крычаўскага райвыканкама Магілёўскай вобласці.

**БелТА.**

### Погода

3 и 4 октября на территории республики сохранится облачная с прояснениями погода. 3 октября временами дожди. 4 октября ночью — по северо-восточной половине кратковременные дожди, днем преимущественно без осадков. 3-го в течение суток +3...+8, 4-го ночью +1...+6, местами заморозки до 0...-2, днем 7—12 градусов тепла.

А што на Гомельшчыне?

### З надзейнымі праваднікамі лягчэй трапіць на еўрапейскі рынак

У Гомельскім адкрытым акцыянерным таварыстве "Гомелькабель" з дапамогай адной з італьянскіх фірм пачалася мадэрнізацыя абсталявання для вытворчасці дэфіцытных эмаліраваных праваднікоў.

Як стала вядома карэспандэнту БелТА, новы эмальагрэгат гамяльчане плануюць набыць у першых чыслах кастрычніка. На думку спецыялістаў прадпрыемства, яго ўстаноўка дасць магчымасць значна палепшыць якасць прадукцыі, знізіць расходы сыравіны і электраэнергіі, а таксама зрабіць гомельскія эмаліраваныя праваднікі канкурэнтаздольнымі на еўрапейскім рынку.

### Гомельскія падшыпнікі ацанілі не толькі ў Чэхіі

Пашырае свае экспартныя пастаўкі Гомельскі электрамеханічны завод. Пасля таго, як яго прадукцыю — падшыпнікі для чэшскіх манеўраных цеплавозаў ЧМЭ-3 — выпрабавалі спецыялісты эстонскага лакаматыўнага дэпо ў Тапе, ёю зацікавіліся і сталічныя чыгуначнікі гэтай балтыйскай дзяржавы.

### Алег Юркевіч даў фору амерыканцам

Імя доктара тэхнічных навук загадчыка аддзела гомельскага Інстытута механікі металапалімерных сістэм Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Алега Юркевіча зойме дастойнае месца ў сусветным даведніку "Людзі года". Паведамленне аб гэтым вучоны атрымаў нядаўна з ЗША. Такім чынам амерыканцы прызналі, што распрацоўкі Алега Юркевіча ў галіне палімерных матэрыялаў і пакрыццяў апярэджваюць па ўсіх артыкулах іх уласныя на 3—4 гады.

### Пара шыць шубы...

"Дабро" на масавую вытворчасць дзіцячых шуб са штучнага футра далі светлагорскаму прадпрыемству "Бел-Шанс" спецыялісты гандлёвых і камерцыйных фірм рэспублікі. Галоўныя вартасці новых мадэлей — прыгажосць, зручнасць і параўнальна невысокая цана. На іх думку, такія шубкі змогуць набыць нават не самыя забяспечаныя сем'і.

**Віктар КОТАЎ, БелТА.**

## 68 дней в неволе



Мы ждем тебя, Павел!

Незлобивые заметки

*Семен БУКЧИН*

## Истинному другу России можно многое простить



Жаловаться на московскую журналистику , и газетную и телевизионную, что она, мол, не уделяет должного внимания Беларуси — безусловный грех. Читаешь, смотришь — про Литву редко, Латвию с Эстонией неделями не вспоминают. Украину и ту не всегда помянут. Зато без Беларуси не обходится почти ни один газетный номер или выпуск теленовостей. Чего там скромничать! Знают о нас в мире. Теперь мы не какой-нибудь "край болот и лесов".

И ведь все благодаря нашему правителю. Кто, как не он, герой первых полос московских газет и телерепортажей! И что особенно замечательно: напор не ослабевает. Бывает, тянется какая-нибудь дохлая неделя, никого не посадят, не отколотят в участке (отделении милиции), не засудят, нет слухов об очередном покушении, и сам правитель, видимо, чувствует себя не в своей тарелке. Нудно ему, тяжко... Тогда появляется какое-нибудь замечательное интервью. И опять есть чем жить! Главное — это чтобы не забывали. И не только в Москве, но и в мире! Что есть такой правитель Лукашенко. И вовсе он не "слабый и лукавый", как писал Пушкин про одного современного ему царя. А наоборот — сильный и одновременно искренний донельзя.

В сентябре Лукашенко был дважды героем фирмы Артема Боровика "Совершенно секретно". Сначала журналист Михаил Маркелов опубликовал беседу с ним в известном ежемесячнике. А затем (27 сентября) в не менее известной передаче РТР нам показали запись этой беседы (разумеется, превышающей объем публикации), а главное, в обрамлении различных интервью, сюжетов из нашей общественной жизни и, конечно же, размышлений самого автора.

Сказать, что мы с особым интересом смотрим московские "трактовки" нашего быта — значит ничего не сказать. Московское "телеокошко" так разнится от белорусского! Разумеется, у каждого из всматривающихся в него из Беларуси свой интерес. Одни, потирая руки, ждут, как в очередной раз долбанут из Москвы нашего правителя. Другие, которым наскучило это долбание, ждут более глубокого проникновения и в собственно белорусскую и в белорусско-российскую ситуацию. Последнее желание удовлетворяется далеко не всегда, хотя комментарии, скажем, Евгения Киселева и Сергея Доренко подчас достаточно серьезны и принципиальны.

Вместе с тем очевидно, что события последних месяцев, в том числе дело Павла Шеремета, высветили если не раскол, то достаточно очевидные различия в подходах и оценках московской журналистики. Собственно, они были заметны и раньше, но сейчас приобрели особую, что ли, яркость. Последний выпуск передачи "Совершенно секретно" — наглядное тому подтверждение.

Если раньше московская журналистика делилась на либерально-демократическую и коммунистическо-ксенофобскую, то ныне ситуация усложнилась. Некая часть либерально-демократического лагеря не то чтобы перешла на коммунистическо-ксенофобские позиции, нет, охранители и шовинисты этим людям по-прежнему чужды и даже отвратительны. Речь идет о государственничестве московских либералов и демократов от журналистики, том "просвещенном" российско-патриотическом государственничестве, во имя которого можно на многое закрыть глаза.

Вот и Михаил Маркелов из "Совершенно секретно" вроде бы критически настроен к лукашенковскому режиму. Он даже ведет репортаж с минских улиц из кабины "воронка" и показывает нам свои руки в наручниках, утверждая, что именно так белорусский правитель предпочитает вести полемику со своими оппонентами. Он как будто стремится быть объективным и, внимательно выслушивая Лукашенко, дает слово оппозиционерам — Шушкевичу, Гончару, Лебедько. Он приходит на пресс-конференцию БНФ. Использует видеосъемки столкновений антилукашенковских демонстраций с милицией, известных сцен жестокого избиения людей омоновцами. Это все, конечно, очень плохо с точки зрения коллеги Маркелова...

Но вот смотрите, восклицает г-н Маркелов, какой ужас: боевики УНА-УНСО переворачивают машины на улицах Минска! Г-н Маркелов делает вид, что не понимает, что процессы, протекающие на Беларуси, как, впрочем, и в России, не могут быть химически чистыми, что большая часть минчан, принявших участие в чернобыльском шляхе в апреле прошлого года, вовсе не намерена брататься с украинскими национал-радикалами. УНА-УНСО, возможно, и имеет какие-то свои интересы на Беларуси, как и некий "Правый реванш", но это все явления абсолютно маргинального характера, не имеющие никакого отношения к достаточно широкому общественному недовольству и возрастающему критическому отношению к режиму Лукашенко в нашей стране.

Ларчик, впрочем, открывается достаточно просто. Оказывается, в то время, как Беларусь крепит союз с Россией, президент Украины Кучма якобы заявляет: пусть они, мол, там объединяются, а мы тем временем на вступление в НАТО нацелимся, маневры с натовцами на Черном море проведем. Поэтому, предупреждает г-н Маркелов, нужно быть бдительным! И трезво оценивать ситуацию. Президент Лукашенко наш друг, а вот "погрязшая в коррупции власть в Киеве" исходит из принципа: чем хуже России, тем лучше нам.

Отсюда понятно и недоумение г-на Маркелова по поводу того, что считающая себя демократической независимая белорусская печать вступилась за посаженных в тюрьму унсовцев. Образованный человек, коллега Маркелов делает вид, что ему неведом один из основных принципов действительно демократической печати: беспокоиться о судьбе сидящих в тюрьме и уже осужденных людей. Беспокойство более чем оправданное в условиях режима, где закон подменяется самодурством и самоуправством, где не может нормально существовать независимая адвокатура, нет открытых судебных процессов и т.д.

Обо всем этом коллега Маркелов предпочитает помалкивать. А вот пугануть белорусским национализмом да еще стыковать его с немецким фашизмом — это пожалуйста. С экрана звучит откровенная ложь: отец Позняка якобы в годы войны редактировал выходившую в Беларуси нацистскую газету. Можно и нужно спорить с Позняком, но зачем же так бессовестно врать, г-н Маркелов? Отец Позняка, солдат Советской Армии, погиб в войну под Познанью и там же похоронен. Ни к каким нацистским изданиям он, естественно, отношения не имел.

Кто снабжает вас информацией, коллега? Вопрос не праздный, если иметь в виду то обстоятельство, что ряд мест передачи "Совершенно секретно" буквально совпадает с кадрами известного заказного фильма "Ненависть. Дети лжи", где антилукашенковские акции на улицах Минска, митинги БНФ перемежаются, монтируются с маршами гитлеровских молодчиков. Почерк более чем знакомый...

При таких "монтажных" методах абсолютно естественным выглядит следующий пассаж автора передачи: "Многие журналисты продолжают информационную войну с Лукашенко. Но сравнение его с Гитлером, а Беларуси с Германией не только неуместно, но и цинично". Хотя бы потому, указывает г-н Маркелов, что в Беларуси была Хатынь. Но именно потому, что в Беларуси была Хатынь, циничными выглядят откровения, сделанные Лукашенко в нашумевшем и буквально поразившем цивилизованный мир интервью корреспонденту германской газеты "Хандельсблатт". Почему бы, в самом деле, г-ну Маркелову не спросить белорусского правителя, с какой стати он считает "немецкий порядок", достигший при Гитлере "высшей точки", тем самым, что "соответствует" его "пониманию президентской республики и роли в ней президента"? Может быть, потому что известен уже традиционный ответ... Но ведь существует документ — магнитофонная запись, кстати, прозвучавшая и по Белорусскому радио.

Но скорее всего г-н Маркелов знает, какие вопросы следует задавать лучшему другу России. И он в конце передачи спрашивает Лукашенко о том, что действительно для него важнее всего. Важнее сидящего в тюрьме Шеремета. Важнее сотен избитых, оштрафованных, униженных людей. Важнее произвола, царящего в Беларуси. С замиранием в голосе г-н Маркелов спрашивает сурового белорусского правителя, не обиделся ли он в связи с обострением отношений с высшим российским руководством, с президентом Ельциным... И получает ответ, которого больше всего и ждал, на который так надеялся. Лукашенко выше личных обид: "Интеграция с Россией — это главное. За это надо бороться".

Конец передачи. За интеграцию, а точнее, за "восточный коридор", за то, чтобы Россия не оказалась в конце XX века отодвинутой к западным границам времен Московского княжества, можно заплатить многим. И судьбами конкретных людей. И судьбой народа, для которого вроде бы блеснула надежда на построение нормального демократического государства.

Что уж тут говорить о журналистской чести и обыкновенной человеческой совести? Цена-то вон какая! Будущее великой России! За такую цену можно и потерпеть дурные манеры белорусского правителя. Да если еще сбрызнуть одеколончиком под названием "Объективность" да напустить вокруг словесного тумана, вроде того, что "Плохой или хороший, но Лукашенко уже вошел в историю"... А раз вошел — так с него и взятки гладки.

Историческая личность! Ничего не попишешь! А главное — какой друг России! Не то что этот Кучма, норовящий сбежать в натовский лес...

Да и с кем тут, в Беларуси, еще разговаривать? Оппозиции настоящей нет. Независимые газеты, морщится г-н Маркелов, какие-то "бестолковые". К тому же, предупреждает он, все они финансируются БНФ и печатаются в Литве. А это, по г-ну Маркелову, дурная аттестация. Сам же БНФ, судя по карикатурно показанной пресс-конференции, выглядит сборищем каких-то национально помешанных недоумков.

Нет никого в Беларуси. Пустыня, посреди которой возвышается мощная фигура лучшего друга России. А у подножия, у самых ботинок, хлопочет г-н Маркелов, тряпочкой пылинки снимает. Чтоб лучше блестело. На что не пойдешь во имя государственных интересов России...

О том, что г-н Маркелов угодил тому, кому хотел угодить, свидетельствует анонс на первой полосе "Советской Белоруссии" (1 октября): "Успех передачи "Совершенно секретно" был закономерным". Так что напрасно вы, коллега, в "воронок" садились и наручники демонстрировали. Успех был просто неизбежен.

Задумаемся!

## Чаму з'езд настаўнікаў можа прайсці міма галоўных адукацыйных праблем Беларусі?

На жаль, у афіцыйных сродках масавай інфармацыі не знайшлося месца для папярэдняга знаёмства і абмеркавання мэтаў і праграмы I з'езда настаўнікаў Беларусі. Колькі я ні звяртаўся да настаўнікаў розных мінскіх школ з адпаведным запытаннем, тлумачэнняў не чуў. Большасць жа (уключаючы дырэктараў) нават не ведалі, што такое мерапрыемства будзе. Праўда, у панядзелак (29 верасня) міністр адукацыі В.Стражаў сказаў у АТН некалькі слоў на гэту тэму, звязаўшы з'езд са школьнай рэформай. Толькі ж рэформы той (у сэнсе кардынальных змен у змесце і сутнасці школьнай адукацыі) няма. Бо прадугледжваецца ў асноўным пераход з 11-гадовага навучання на 12-гадовае з адпаведнай перапрацоўкай праграм.

Адукацыя ж закладвае духоўны фундамент жыццядзейнасці грамадства, гэта значыць асновы ўзаемаадносін у ім, зыходную сутнасць і выніковасць эканомікі, культуры, экалогіі, міжнароднага супрацоўніцтва. Нічога гэтага напярэдадні з'езда не абмяркоўвалася. Ні аднаго радка на гэту тэму не было нават на старонках адзінай на рэспубліку ўрадавай беларускамоўнай газеты "Звязда". Таму такі высокі форум можа прайсці, не закранаючы **галоўных праблем сучаснай Беларусі,** якія заключаюцца ў наступным:

— захаванні і ўмацаванні самастойнай беларускай дзяржаўнасці. Бо калі ўвойдзем у склад Расіі, уз'яднаемся з "великим русским народом" (чаго так упарта дамагаюцца пэўныя сілы), то з кожнага нашага дзіцяці будзе "мэтанакіравана рабіцца з маленства халоп для імперыі". І тады ўся адукацыя будзе мецць зусім не беларускі напрамак;

— зберажэнні і развіцці асноў самабытнасці беларускага этнасу з яго мовай і сукупным характарам, якія закладзены прыродай і дапоўнены *Гісторыяй*, а зараз пастаўлены на мяжу поўнага знішчэння праз канчатковую русіфікацыю. Бо калі знікне беларускі этнас, то знікнуць і ўсе нашы праблемы з адукацыяй. Не спатрэбяцца надалей і з'езды настаўнікаў. Але ж *Гісторыя* (як Вялікі стваральнік і фіксатар падзей) ніколі нам не даруе гэтага самазабойства. Бо этнасы створаны Боскімі сіламі невыпадкова. А для таго, каб праз дабрачыннае ўзаемадзеянне тых рознасцяў забяспечыць агульначалавечай супольнасці ўмовы для самаўдасканалення. Выбіванне з таго прыродай створанага гарманічнага ланцуга 12 мільёнаў беларусаў стане вялікай шкодай для ўсіх людзей свету;

— стварэнні і ўмацаванні на аснове карэннага беларускага этнасу беларускай нацыі як дзяржаўнай еднасці нашага грамадства. Бо калі яе не будзе, то не стане і самастойнай дзяржавы;

— пераглядзе сутнасці слова *нацыяналізм.* Бо ён — не ганебная з'ява, а ахоўнае пачуццё, закладзенае прыродай у кожным нармальным чалавеку для зберажэння сваёй нацыі, яе станоўчай жыццядзейнасці пры павазе правоў на тое ж прадстаўнікоў іншых нацый. Выбіццё нацыянальнага пачуцця з беларусаў раўназначна іх этнічнаму знішчэнню;

— выхаванні ў людзей павагі да гістарычных набыткаў беларускага народа, неабходнасці захавання сваёй уласнай гістарычнай памяці для аналізу сучаснага і выбару шляхоў у будучае. Бо ўсюды, дзе няма станоўчага мінулага, не можа быць і станоўчага будучага;

— распрацоўцы асноў суадносін паміж уласна нацыянальным і агульначалавечым у жыццядзейнасці наогул, і ў адукацыі ў асаблівасці, на аснове прынцыпу: праз нацыянальнае — да агульначалавечага, ад агульначалавечага — да нацыянальнага. Толькі ў гэтым выпадку можа захавацца самабытная самастойнасць народаў і іх гарманічнае развіццё;

— выхаванні ў людзей павагі да прадстаўнікоў уласнай нацыянальнай эліты. Бо яна — мозг народа. Ад яго ж якасцяў залежыць усё.

І апошняе. Ёсць падставы лічыць, што нішто з вышэйадзначанага не будзе заўважана. І па неразуменню, і па наўмыснасці. Падставы для такога меркавання ў праявах мэтанакіраванага падбору дэлегатаў і гасцей з'езда. Таму, напрыклад, Таварыства беларускай мовы (ТБМ) Мінска не атрымала ніводнага запрашальнага білета для ўдзелу ў яго працы. І можа здарыцца так, што ўвесь вынік гэтага высокага форуму звядзецца да ўхвалення існуючага ў краіне рэжыму. Прэзідэнт жа ў адказ дасць абяцанне павысіць настаўнікам зарплату. Толькі вось застанецца загадкай: за чый кошт гэта будзе зроблена? Бо нябачна (пры вонкавым назіранні) такое магчыма толькі ўрэзкай сродкаў існавання астатняй часткі насельніцтва, уключаючы пенсіянераў, урачоў, навукоўцаў, сялян і іншых. Звязана яно і з тым, што высокааплачваемыя, непамерна раздутыя службы "безопасности президента", тыпу КДБ, МУС, "Алмаз", "Пантэра", "Альфа" і іншых падраздзяленняў, названых у артыкуле "Батькохранители" ("Комсомольская правда" ад 19.09.97 г.), не будуць закрануты. Застануцца ў добрым забеспячэнні ў такой колькасці нам непатрэбныя беларускія вайсковыя падраздзяленні, што "абараняюць інтарэсы расіян, забяспечваючы проціпаветраную абарону і асноўныя выдаткі па бяспецы агульнай граніцы Саюза" (словы А.Р.Лукашэнкі, "Звязда" ад 30.09.97 г.).

**Аляксей САЛАМОНАЎ,**
**прафесар, старшыня рады Таварыства беларускай мовы г.Мінска.**

Чулі?

### Гары Паганяйла выключаны з калегіі адвакатаў

Рашэннем Прэзідыума Мінскай гарадской калегіі адвакатаў з яе членаў па ўласнаму жаданню выключаны Гары Паганяйла.

Каменціруючы карэспандэнту БелТА гэты факт, у прэс-службе Міністэрства юстыцыі паведамілі, што ў адпаведнасці з пунктам 1.4 Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 12 ад 3 мая 1997 года "Аб некаторых мерах па ўдасканаленню адвакацкай і натарыяльнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь" адвакацкую дзейнасць могуць ажыццяўляць толькі асобы, якія з'яўляюцца членамі калегій адвакатаў.

**БелТА.**

### У будучых беларускіх дыпламатаў... наваселле

У першы дзень кастрычніка факультэт міжнародных зносін Беларускага дзяржаўнага універсітэта святкаваў сваё наваселле. Павіншаваць студэнтаў і выкладчыкаў прыйшлі паслы Кітая, Італіі і Францыі, а таксама прадстаўнікі пасольстваў Латвіі, ЗША, Індыі, Літвы, Украіны, акрэдытаваныя ў Беларусі.

Паводле слоў рэктара БДУ Аляксандра Казуліна, які выступіў на цырымоніі адкрыцця, вышынны будынак па вуліцы Францыска Скарыны будаўнікі адрамантавалі і адрэстаўрыравалі за 10 месяцаў. Каштавала гэта амаль што мільён долараў.

Аб такім шчодрым падарунку самаму маладому факультэту БДУ (а яму споўнілася толькі два гады) паклапаціліся універсітэт і Адміністрацыя прэзідэнта краіны. Плошча будынка — 5,5 тысячы квадратных метраў. Тут больш за 60 аўдыторый для заняткаў 789 студэнтаў, якія вучацца на чатырох аддзяленнях факультэта, дзе рыхтуюць спецыялістаў па міжнароднаму праву, міжнародных зносінах, міжнароднай эканоміцы і турызму.

**Вольга ШЧАДРЫНА.**

Спешите!

## Стажировка в США может стать реальностью!

Информационное агентство Соединенных Штатов (USIA) совместно с Информационной службой Посольства США в Беларуси объявляет о начале новой программы международного обмена специалистов под названием Community Connections. Участники программы получат возможность пройти стажировку в течение 3—5 недель в американских компаниях и организациях. Все расходы по проведению программы несет американская сторона. Отбор участников будет проводиться в пяти городах республики: Бресте, Гомеле, Гродно, Минске и Молодечно.

В программе могут участвовать:

*владельцы или руководители частных компаний среднего и малого бизнеса, их ведущие специалисты, менеджеры верхнего и среднего звена, а также независимые предприниматели;*

*специалисты-профессионалы, занятые в негосударственном секторе и представляющие различные неприбыльные, неправительственные, юридические, образовательные организации, а также профессиональные ассоциации.*

Необходимые условия: хорошее знание английского языка, опыт работы, компетентность и профессионализм в своей сфере деятельности.

Презентация, посвященная программе Community Connections, состоится в Минске 4 октября в 11.00 в конференц-зале гостиницы "Юбилейная". Приглашаются все желающие.

**Анна СОУСЬ.**

## Заявление

Мы, участники международного семинара "Свобода и ответственность средств массовой информации" и региональной встречи руководителей журналистских союзов (Беларуси, Латвии, Литвы, России, Украины, Финляндии и Эстонии) в городе Вильнюсе, крайне обеспокоены судьбой нашего коллеги — руководителя белорусского отделения Общественного российского телевидения (ОРТ) Павла Шеремета и членов его съемочной группы.

П.Шеремет более двух месяцев находится в тюрьме за то, что выполнял профессиональные журналистские обязанности.

Поводом для репрессивных мер послужил его репортаж с белорусско-литовской границы, в котором журналист рассказал о потоках контрабанды, проходящих через неохраняемый участок границы.

Это журналистское расследование вызвало неадекватную реакцию белорусского руководства — вместо благодарности за помощь в борьбе с коррупцией и контрабандой наркотиков, оружия, спиртных напитков, нелегальной миграции П.Шеремета обвинили в нарушении государственной границы и завели уголовное дело.

Вызывает возмущение тот факт, что еще до суда президент Беларуси А.Лукашенко, развернув через официальные СМИ травлю журналиста, обвинил Павла Шеремета в связях со спецслужбами зарубежных государств и даже в подготовке покушения на жизнь главы государства.

Считаем, что репрессии против съемочной группы ОРТ — это попытка белорусских властей расправиться с журналистами за объективное освещение ситуации в Беларуси, где налицо все признаки тоталитарного режима.

Мы надеемся, что руководители стран, принявшие участие в вильнюсском саммите 5—6 сентября вместе с А.Лукашенко и заявившие о своей приверженности демократическим преобразованиям, будут более активно использовать свой авторитет для реальной защиты демократии, прав человека и свободы прессы в Беларуси.

**Вильнюс.**
**30 сентября 1997 г.**

Лікбез: чытач — чытачам

# Ці ёсць эксплуатацыя працоўных пры сацыялізме?

Сацыялістычная дзяржава кіруе грамадствам з дапамогаю чыноўнікаў, ствараючы з іх кіруючы (пануючы) наменклатурны клас, які распараджаецца ўласнасцю, сродкамі працы і вынікамі яе, а галоўным уладальнікам застаецца дзяржава. У каго-небудзь можа стварыцца ілюзія, што калі кіруючы клас не валодае непасрэдна ўласнасцю, а толькі распараджаецца ёю, то ён, быццам, ужо не з'яўляецца эксплуататарскім. Але гэта не так. Раз працоўныя жывуць больш дрэнна, чым у капіталістычных краінах, эксплуатуюцца больш жорстка, то адукаванаму чалавеку і таму, хто можа і хоча думаць, няцяжка зразумець, хто іх эксплуатуе, рабуе і прысвойвае вынікі іх працы.

Пры сацыялізме эксплуатацыя працоўных не ляжыць на паверхні, а добра замаскіравана. Але прысвойванне і рабаванне ёсць. Яно ажыццяўляецца кіруючым класам, чыноўнікамі, пад дахам дзяржавы. Лічыцца, што размеркаванне заробкаў адбываецца, як быццам, справядліва, бо павінна так рабіцца. Але на самой справе наменклатура сябе не крыўдзіць і заўсёды возьме болей, атрымае лепшыя кватэры, хутчэй уладкуе сваіх дзяцей у прэстыжныя навучальныя ўстановы, будзе лячыцца ў лепшых медыцынскіх установах (лечкамісіях), атрымліваць дэфіцытныя рэчы [illegible], хутчэй атрымае льготныя крэдыты, а вы, калі не ўваходзіце ў іх клан, не зможаце ўсяго гэтага зрабіць. Наменклатурны клас не вельмі дапускае ў свае кланы іншых. Тое, што дазволена Юпітэру, не дазволена быку. Сацыялізм як сістэма стварае спрыяльныя ўмовы для карупцыі і крадзяжу.

У якасці сродку эксплуатацыі і ашуканства працоўных пры сацыялізме выкарыстоўваюцца быццам бы "бясплатныя" адукацыя, медыцына, кватэры, бясплатны або танны адпачынак, у выніку чаго працоўныя атрымліваюць нізкія, недаплачаныя заробкі і пенсіі. Заробкі працоўных складаюць толькі 10—20% ад кошту створанага прадукту супраць 50—60% у капіталістычных краінах. Але і агульны кошт створанага прадукту ў гэтых краінах значна большы з прычыны лепшай зацікаўленасці ў працы, перадавых тэхналогій і большай прадукцыйнасці працы. За малыя заробкі добра можа працаваць толькі дурань.

Апошнім часам рабочыя мінскіх заводаў мелі сярэдні месячны заробак у памерах 60—80 долараў ЗША, а тым часам заходнія рабочыя атрымліваюць ад 2,0 да 5,5 тысячы долараў. [illegible] (!) разоў, бо ім выплачваецца зарплата ў поўных памерах, а нам наўмысна не даплачваецца на пакрыццё "бясплатных" паслуг. Дзяржава афіцыйна аб нас клапоціцца, але, напэўна, яна больш клапоціцца аб сабе. Вось так, быццам бы гуманная і высакародная задума аб бясплатным лячэнні, навучанні і кватэрах ператвараецца ў сродак эксплуатацыі працоўных. На самой справе бясплатных адукацыі, медыцыны, кватэраў, адпачынку не можа быць. Гэта міф, створаны бальшавікамі для ахмурэння працоўных, добра замаскіраваная прынада для прастакоў, бо за гэтыя паслугі ўскосна плацяць усе, нават той, хто імі не карыстаецца, не вучыцца, не хварэе, не атрымлівае кватэры, не адпачывае [illegible]. Відавочна, такая сістэма несправядлівая, бо ператварае нас з вамі ў прыгонных, якімі ролю феадала выконвае дзяржава з памагатымі, чыноўнікамі гэтага феадала. Такі "сацыялізм" болей падобны да **дзяржаўнага неафеадалізму.** Дзяржава значную частку нашага заробку адбірае а[illegible] гаворачы аб гэтым услых, каб потым частку сродкаў вярнуць, каму пашанцавала, праз паслугі, але **вяртае не ўсё, не ўсім і не ў роўных памерах кожнаму.** Зразумела, што наменклатурны клас ад гэтага мае вялікія прыбыткі, бо ён тут "камандуе парадам", гэта яго кармушка, за якую ён "гарой стаіць", лічачы "бясплатныя" паслугі галоўнымі "перавагамі сацыялізму".

У капіталістычных краінах плацяць за паслугі самі працоўныя, кожны са сваіх вялікіх заробкаў, без пасрэдніцтва дзяржавы. А калі не карыстаюцца імі, то і не плацяць, і грошы застаюцца ім на іншыя мэты. А ў нас іх забірае дзяржава, якая нас і эксплуатуе з дапамогаю чыноўнікаў. У капіталістычных краінах багатыя плацяць і за навучанне і за больш якаснае лячэнне, а самыя бедныя могуць вызваляцца ад платы, дзякуючы фондам, ахвяраванням, міласэрнасці і дапамозе бедным. А галоўнае, адсутнічаюць умовы для рабавання працоўных праз паслугі, якія ў нас ператварыліся ў асяродак для сілкавання карупцыянераў. Барацьба з карупцыяй — справа цяжкая, бо яна можа заразіць і тых, хто з ёю павінен змагацца. Таму лепей, каб умоў для карупцыі, якія ёсць у нас, не было ў самой сацыяльна-эканамічнай сістэме.

Недаплачаныя працоўным сродкі ў былым СССР выкарыстоўваліся і на іншыя мэты, не звязаныя з "бясплатнымі" паслугамі: на падтрымку замежных дыктатарскіх рэжымаў, "брацкіх" камуністычных і рабочых партый і на іншыя, не зусім законныя мэты. І ў нас на Беларусі падобнае зараз робіцца, калі праводзяцца вялікія, пампезныя святкаванні, усялякія "сходы", "базары" і іншае. Калі адзін міліцыянт у Беларусі прыпадае на 80 беларусаў, то ў суседняй Польшчы адзін паліцыянт — ажно на 400 палякаў. Гэта значыць, што ў Беларусі міліцыі ў 5 разоў на аднаго чалавека болей. А гэта патрабуе вялікіх сродкаў за наш з вамі кошт з тых жа недаплачаных зарплат і пенсій. Бо і зарплаты і пенсіі міліцыянтаў [illegible]. Вось чаму ў працоўных Беларусі такія малыя зарплаты і пенсіі.

У сацыялістычнай сістэме цяжка выявіць парушэнні, бо яны добра замаскіраваны і [illegible] размовамі пра клопат аб працоўных. "Клопатаў", і асабліва размоў аб іх, многа, а жыццё працоўных дрэннае. Трэба верыць не размовам, а дзеянням. Хлестакоў таксама многа і прыгожа гаварыў, што нават спадабаўся гараднічаму, яго жонцы і дачцэ, бо яны былі дурнямі, але гэты самазванец нічога карыснага не зрабіў і аказаўся хлусам, у выніку чаго камедыя заканчылася мёртвай сцэнай. Можа, і на Беларусі таксама хутка адбудзецца, бо тое, што зараз робіцца, вельмі нагадвае камедыю "Рэвізор".

Такім чынам, эксплуатацыя працоўных пры сацыялізме ёсць, ажыццяўляецца праз бясплатнае размеркаванне пад дахам дзяржавы і з дапамогаю чыноўнікаў. Яна адбываецца ў два этапы, як бы двойчы. Спачатку ў выглядзе недаплаты заробкаў і пенсій, а потым у невяртанні [illegible] меншыя, чым у працоўных капіталістычных краін. А калі пенсіянер, дажыўшы да пенсійнага ўзросту, заўчасна памірае, яго пенсія дастаецца дзяржаве, а не нашчадкам, што было б вельмі гуманна і справядліва, каб пасля смерці пенсіянера яго нашчадкі некаторы час атрымлівалі пенсію памерлага. Стварыўся непрымальны парадак, што чым раней будуць паміраць пенсіянеры, тым наша дзяржава стане больш багатай. Гэта вельмі дрэнна, амаральна і сведчыць аб несправядлівасці пенсійнага закона, бо зароблены пенсіянерам грошы належаць не дзяржаве, а яго нашчадкам. Але, напэўна, гэтая праблема спрэчная, і хай па ёй выкажуцца таксама іншыя. Гэта прапанова для роздуму.

А выйсце для паляпшэння жыцця працоўных бачыцца ў тым, каб паслугі аплачваліся галоўным чынам тымі, хто імі карыстаецца, а працоўныя атрымлівалі поўныя заробкі. Гэта будзе больш справядліва, чым тое, што мы зараз маем. [illegible]

Хай і багатыя таксама плацяць за паслугі, а не карыстаюцца імі за кошт працоўных і дапамагаюць бедным. Трэба, каб было наадварот: не бедныя павінны дапамагаць багатым, як у нас зараз адбываецца, а багатыя павінны дапамагаць бедным. [illegible] для карупцыі, бо пры сацыялізме карупцыянеры [illegible], а яны зноў з'яўляюцца, бо для іх пры сацыялізме ёсць кармушка і асяродак для сілкавання, якія трэба ліквідаваць.

Мінск.

**Марат ГІРКО.**

Фотофакт

# Всем бы такие Заходы. Как под Шкловом...



В деревне Заходы Шкловского района строители сдали в эксплуатацию новое здание школы на 198 мест с уютными классами и различными методическими кабинетами, оборудованными на самом современном уровне.

**На снимке:** *новое здание школы.*

**Фото Николая ТИТОВА, БелТА.**

Напярэдадні

## Еўропа — дзелавы цэнтр

Так названа міжнародная сустрэча дзелавых колаў кантынента, якая пройдзе ў Мінску 17—20 лістапада. На яе запрошаны прадстаўнікі банкаў, фірм, гандлёва-прамысловых палат з СНД, а таксама Польшчы, Германіі, Чэхіі, Славакіі, Эстоніі, Літвы, Латвіі, Венгрыі, спецыялісты Міжнароднай фінансавай карпарацыі, эксперты TACIS.

Як нам паведаміў прэзідэнт Беларускага саюза прадпрымальнікаў Уладзімір Карагін, чакаецца не радавая канферэнцыя, а напоўненая дзелавым зместам сустрэча. У гэты час у Мінску адкрыецца спецыялізаваная міжнародная выстава абсталявання для малога і сярэдняга бізнесу. Удзельнікі змогуць азнаёміцца з умовамі ў перспектыўнай свабоднай эканамічнай зоне ў раёне аэрапорта "Мінск-2". Спадар Карагін, які днямі пабываў у Брусэлі, перадаў запрашэнне еўрапейскім прадпрымальнікам наведаць Мінск, і яно выклікала пэўную цікавасць.

Кантактны тэлефон 230-39-65, факс 227-89-60.

**Яўген ТАЎГЕНЬ.**

Прыватызацыя

## Чаму грамадзяне так неахвотна набываюць ва ўласнасць жыллё?

Здавалася б, што можа быць прыемней, як набыць ва ўласнасць дом, кватэру. Але ж не... З 1989 года ідзе прыватызацыя жылля, і толькі 41% яго займеў уласнікаў. Большасць насельніцтва, як бачым, не надта гарыць жаданнем "перапісаць" на свой рахунак сваё жытло. Чаму?

Думаецца, галоўная прычына ў тым, што надта малая вызначана жыллёвая квота. Яна пакрывае толькі малую частку расходаў. За прыватызаваныя кватэры прыходзіцца добра раскашэльвацца. Вось лічбы. Кошт кватэр, прыватызаваных у студзені — жніўні гэтага года, склаў 41,9 мільярда рублёў. Дык вось, жыллёвай квотай пагашана толькі 3,2 мільярда рублёў. З дапамогай прыватызацыі дзяржава выкачала з кішэняў грамадзян толькі з пачатку гэтага года 9,9 мільярда рублёў.

А дзе людзі возьмуць вялікія грошы, калі яны ледзь-ледзь зводзяць канцы з канцамі? Таму прыватызуюць жыллё толькі тыя, хто мае грошы. Большасць такой магчымасці не мае.

**Яўген ТАРАНАЎ.**

Праекты

## Яшчэ адна зона. Эканамічная

Хутка ў Беларусі з'явіцца яшчэ адна свабодная эканамічная зона — "Гомель-Ратон". Гомельскія ўлады ўжо зацвердзілі яе тэрытарыяльныя межы. Свабодная эканамічная зона будзе ўключаць у сябе навукова-вытворчае аб'яднанне "Ратон", якое вырабляе прадукцыю для радыёэлектроннай прамысловасці, а таксама каля 4,3 тысячы гектараў бліжэйшых зямель. Можна гаварыць ужо аб 12 праектах магчымага супрацоўніцтва ў рамках СЭЗ з замежнымі інвестарамі на суму ў дзесяткі тысяч амерыканскіх долараў.

Усе тэхнічныя і ўстаноўчыя дакументы гомельскай СЭЗ ужо перададзены ў Савет міністраў. Канчатковае рашэнне будзе прынята да 1 кастрычніка.

**Ганна ЗАЙЦАВА.**

Афіцыйна

## Прысвоены ганаровыя званні

Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка падпісаў указы аб прысваенні ганаровых званняў.

За вялікі асабісты ўклад ва ўдасканаленне навучальна-выхаваўчага працэсу, укараненне новых форм навучання і шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць першаму прарэктару Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны Міхаілу Васільевічу Селькіну прысвоена ганаровае званне "Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь".

За значны ўклад у арганізацыю медыцынскай дапамогі насельніцтву і высокае прафесійнае майстэрства галоўнай медыцынскай сястры Магілёўскай гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі Раісе Васільеўне Ануфрыевай і старшай медыцынскай сястры Бобрыкаўскай участковай бальніцы Пінскага раённага тэрытарыяльнага медыцынскага аб'яднання Раісе Васільеўне Ляўчук прысвоена ганаровае званне "Заслужаны работнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь".

**БелТА.**

Ну и ну!

## Как молодые "патриоты" продавали за доллары досье на Янчевского

Случай этот, пожалуй, из редчайших. В редакцию "Народной воли" заявились нежданные визитеры. "Не заинтересует ли компромат на Всеволода Янчевского?" — ненавязчиво и робко спросил первый вошедший.

— У вас подготовлена статья или письмо в редакцию?

— Нет, у нас документы. Редчайшие... Сейчас принесем.

Посетитель вышел и вскоре вернулся. Но не один. А с хранителем "тайны века" в черных очках, который извлек из дипломата увесистую папку с откcерокопированными материалами.

Вначале показал справки-счета, оформленные на имя Янчевского, со штемпелями зарубежных банков, потом — "доверительное" письмо некоего Кирилла из Вашингтона, который подтверждал готовность выплатить "оговоренную" крупную сумму долларовых дензнаков.

— Ну как, заинтересовали документы? Сколько дадите "зелененьких"?

— ?! — моему изумлению, казалось, не было границ.

Не скрою, еще до создания БПСМ навещали редакцию представители Янчевского (тогдашнего "патриотического движения"), но делали это безвозмездно. И с одной целью — показать, кто есть кто и как стремятся отдельные "патриоты" к власти, как пожинают предоставленные ведомством Ивана Титенкова блага, как заверяют "всенародно избранного" в "неугасающей к нему любви и преданности".

— У нас оригиналы есть, — заговорил высокий, с пухлыми, как у негра, губами парень в черных очках. — Если согласитесь приобрести материалы, наш человек из окружения Янчевского предоставит их хоть целый том...

— А не вы ли "тот человек"?

— Это к делу не относится.

